БОЛЬШ ЗА 40 СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ДЛЯ БЕЛАЭС
Каго яшчэ рыхтуюць у МДЭІ імя А. Д. Сахарава БДУ?
Стар. 2

БРЫШ – ЛЕГЕНДА АТАМНАЙ ГАЛІНЫ
Выхадзец з БДУ Аркадзь Брыш – адзін з выбітных канструктараў XX стагоддзя, стваральнікаў ядзернай зброі
Стар. 4–5

БЕЗ ТЭРМІНУ ДАЎНАСЦІ
На гістфаку стварылі два дакументальныя фільмы пра БДУ ў часы вайны. Рыхтуецца трэці
Стар. 6

НАВУКА, МАСТАЦТВА І ПРАФЕСІЯ
Да 30-годдзя кафедры паліталогіі юрыдычнага факультэта БДУ
Стар. 7

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»

8 чэрвеня 2020 года, № 9 (2231)



Новыя задачы – новы сайт

З красавіка БДУ запусціў абноўленую версію афіцыйнага інтэрнэт-сайта. Пра працу над новай версіяй сайта, яго функцыянал і тэхналогіі – у нашым матэрыяле.

Рэдызайн наспеў

Меркаванні, колькі павінен працаваць сайт да частковых або глабальных пераробак дызайну, структуры і функцыяналу, разыходзяцца. Многія маркетолагі сцвярджаюць, што сайт мае патрэбу ў мадэрнізацыі кожныя 2–3 гады. Распрацоўшчыкі праграмнага забеспячэння лічаць, што такія пераробкі занадта частыя, і схіляюцца да 4–5 гадоў. SEO-аптымізатары, якія адладзілі пытанні пошукавага прасоўвання, пры высокіх пазіцыях сайта наогул параяць нічога не мяняць. Аналіз сайтаў 200 вядомых сусветных брэндаў, у тым ліку ўніверсітэтаў, вывеў сярэднюю працягласць «жыцця» сайта да рэдызайну – 2 гады 66 дзён. Дакладнага адказу на пытанне, калі трэба пачынаць распрацоўваць новую версію сайта, няма. Але калі змены вакол становяцца істотнымі, то рэдызайн неабходны.

Візуальна сайт БДУ апошні раз мяняўся ў 2015 г., праграмна – яшчэ раней. За некалькі гадоў змяніўся інтэрнэт, яго хуткасць, тэхналогіі і дэвайсы карыстальнікаў, змяніліся асноўныя партнёры і мэтавая аўдыторыя ўніверсітэта. Напрыклад, паводле звестак «Яндэкс Метрыкі» і Google Analytics, у 2019 г. больш за 45 % наведвальнікаў сайта былі мабільнымі, адбылося павелічэнне колькасці карыстальнікаў з Кітая на 50 %, значна павялічыліся заходы на сайт з сацыяльных сетак. Таму рэдызайн сайта наспеў – ён быў выкліканы праграмным, функцыянальным і візуальным састарэннем, адсутнасцю адаптыўнасці (магчымасці правільнага адлюстравання сайта на розных прыладах з рознымі характарыстыкамі), неадпаведнасцю асноўным патрабаванням карыстальнікаў і пошукавых сістэм.

Мадэрнізацыя сістэмы сайтаў БДУ, у тым ліку галоўнага сайта ўніверсітэта, была названая адным з найважнейшых напрамкаў стратэгіі лічбавай трансфармацыі БДУ. Мадэрнізацыя працягнецца, бо не сакрэт, што многія сайты падраздзяленняў і факультэтаў распрацоўваліся больш за 10 гадоў таму і не адпавядаюць актуальным уяўленням пра вэб-рэсурс.

Дынаміка, інтэрактыў і відэакантэнт

Сучаснае пакаленне студэнтаў і абітурыентаў сярод багацця рэсурсаў выбірае тыя, якія адпавядаюць іх запытам, прыцягваюць візуальна і хутка працуюць на любым з мноства дэвайсаў.

Працяг на с. 3

ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

У БДУ АБНОЎЛЕНА ДОШКА ГОНАРУ. На ёй ушанаваны 32 супрацоўнікі і 32 студэнты за заслугі і дасягненні ў адукацыйнай, навуковай, метадычнай, інавацыйнай, кіраўніцкай, спартыўнай дзейнасці па выніках 2019 года.

На ўрачыстай цырымоніі рэктар ***Андрэй Кароль*** адзначыў, што, нягледзячы на знешнія фактары, традыцыя абнаўляць Дошку гонару застаецца ва ўніверсітэце і падтрымліваецца дзякуючы людзям, якія натхняюць, матывуюць на новыя вынікі і з'яўляюцца прыкладам для іншых супрацоўнікаў. Кіраўнік ВНУ пажадаў усім прысутным новых дасягненняў і выказаў спадзяванне, што праз год мерапрыемства пройдзе ў традыцыйным фармаце з усімі намінантамі.

Ад імя супрацоўнікаў выступіў намеснік начальніка ўпраўлення па справах культуры ***Аляксандр Ігнатчык***. Кажучы пра ролю БДУ ў сваёй прафесійнай дзейнасці, ён назваў універсітэт тэрыторыяй сэнсаў і матывацыйным стрыжнем для развіцця.

Магістрантка гістарычнага факультэта ***Ганна Блізнюк*** у падзячнай прамове падкрэсліла, што зараз у яе новая і вельмі адказная місія – годна прадстаўляць універсітэт.

КРУГЛЫ СТОЛ «ВЫШЭЙШАЯ АДУКАЦЫЯ ВА ЎМОВАХ ПОСТПАНДЭМІІ» прайшоў у БДУ. Ён арганізаваны сумесна з Беларускім інстытутам стратэгічных даследаванняў (БІСД) з мэтай вызначэння стратэгіі развіцця адукацыі ў постпандэмічны перыяд. У дыскусіі прынялі ўдзел першы намеснік міністра адукацыі Беларусі Ірына Старавойтава, рэктар БДУ ***Андрэй Кароль***, дырэктар БІСД ***Алег Макараў***, генеральны дырэктар МАЗа ***Валерый Іванковіч***, а таксама прадстаўнікі міністэрстваў эканомікі і працы і сацыяльнай абароны нашай краіны.

Удзельнікі абмеркавалі інавацыйныя падыходы ў адукацыі з выкарыстаннем сучасных IKT, разгледзелі рызыкі і перавагі выкарыстання дыстанцыйных формаў, закранулі пытанне асобы студэнта ў навучальным працэсе, масавай і элітарнай адукацыі. Падчас анлайн-сустрэчы была адзначана неабходнасць актывізацыі і пошуку новых формаў узаемадзеяння працадаўцы і ўніверсітэтаў, умацавання ўзаемнага супрацоўніцтва прадпрыемстваў і ўстаноў адукацыі ў падрыхтоўцы кадраў.

МІЖНАРОДНАЯ ВІДЭАКАНФЕРЭНЦЫЯ ЎНІВЕРСІТЭТАЎ КРАІН СНД адбылася 26 мая з удзелам прадстаўнікоў БДУ, а таксама навукоўцаў з дзевяці краін: Беларусі, Расіі, Казахстана, Узбекістана, Кыргызстана, Арменіі, Таджыкістана, Азербайджана, Малдовы.

Перад удзельнікамі канферэнцыі выступілі прарэктар па вучэбнай рабоце і інтэрнацыяналізацыі адукацыі БДУ ***Канстанцін Казадаеў***, дырэктар Інстытута краін Азіі і Афрыкі МДУ імя М. В. Ламаносава ***Ігар Абылгазіеў***, рэктар Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта ***Мікалай Крапачоў***, рэктар Ташкенцкага дзяржаўнага ўніверсітэта ўсходазнаўства ***Гулчэхра Рыхсіева***, в. а. рэктара Ерэванскага дзяржаўнага ўніверсітэта ***Гегам Геваркян*** і інш.

Даклады канферэнцыі былі прысвечаны сацыяльна-эканамічным пытанням, падатковаму рэгуляванню ва ўмовах каранавіруса, уплыву глабальнай пандэміі на эканамічную бяспеку краін, а таксама захадам па нейтралізацыі негатыўных наступстваў.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

УНІВЕРСІТЭТ
8 чэрвеня 2020 года, № 9 (2231)

Больш за 40 спецыялістаў для БелАЭС

МДЭІ імя А. Д. Сахарава быў створаны для падрыхтоўкі прафесійных кадраў, якія змогуць мінімізаваць наступствы чарнобыльскай катастрофы. Цяпер тут навучаюць унікальных спецыялістаў экалагічнага профілю, займаюцца даследаваннямі радыяцыйнага фону і ствараюць IT-прадукты для маніторынгу навакольнага асяроддзя.

У лабараторыі эксперыментальнай імуналогіі ФЭМ

Сяргей Маскевіч

Марыя Гермянчук

Базавая арганізацыя па экалагічнай адукацыі

– Наш інстытут прызнаны базавай арганізацыяй дзяржаў-удзельніц СНД у галіне экалагічнай адукацыі, паколькі гэта адзіная на постсавецкай прасторы прафільная экалагічная ўстанова адукацыі, якая мае прыродазнаўча-навуковую накіраванасць, – тлумачыць **Сяргей МАСКЕВІЧ,** дырэктар МДЭІ імя А. Д. Сахарава. – Сёння мы рыхтуем спецыялістаў міждысцыплінарнага профілю, праводзячы падрыхтоўку ў галіне фізікі, хіміі, біялогіі. У нас шырокі спектр спецыяльнасцяў экалагічнага профілю. На ***факультэце маніторынгу навакольнага асяроддзя*** мы рыхтуем інжынераў, якія валодаюць і тэхнічнымі аспектамі маніторынгу паветра, вады, глебы і г. д., і нарматыўна-прававой базай у галіне экалогіі, ведаюць міжнародныя стандарты. На ***факультэце экалагічнай медыцыны*** рыхтуем біёлагаў-аналітыкаў і біёлагаў-экспертаў, якія авалодваюць сучаснымі біяхімічнымі і цытагенетычнымі метадамі біямедыцынскай і экалагічнай дыягностыкі. Акрамя таго, сфарміравалися спецыяльнасці ў галіне радыеэкалогіі, якія і ў тэхналагічным, і ў метадычным плане добра распрацаваны. Рыхтуем спецыялістаў, якія ўмеюць выкарыстоўваць радыеактыўнае выпраменьванне ў медыцынскіх мэтах. Што датычыцца ў цэлым спецыяльнасці *«медыцынская фізіка»*, то яе пачалі развіваць нашмат раней у Еўропе і ў Расіі. У нас яна з'явілася на базе спецыяльнасці *«ядзерная радыяцыйная бяспека»*. Гэта важна, таму што ў яе рамках былі створаны тэхналагічныя і метадычныя ўмовы, вырашаны пытанні: як працаваць з радыеактыўным выпраменьваннем, як ажыццяўляць вымярэнні, як гарантаваць бяспеку. Акрамя таго, наш інстытут – гэта пляцоўка, на якой МАГАТЭ (Міжнароднае агенцтва па атамнай энергіі) ужо больш за дзесяць гадоў праводзіць Рэгіянальныя паслядыпломныя адукацыйныя курсы па радыяцыйнай абароне і бяспецы крыніц іанізуючага выпраменьвання.

Спецыялісты па радыяцыйнай бяспецы

– Гэта вельмі рэдкія спецыялісты, іх падрыхтоўка досыць дарагая. Яны праходзяць практыку ў Обнінску, на дзеючай АЭС «Казладуй» у Балгарыі, у Вене і ў Францыі. Дзякуючы падтрымцы МАГАТЭ мы адпраўляем студэнтаў стажыравацца туды, дзе самыя перадавыя тэхналогіі і падыходы да пытанняў забеспячэння радыяцыйнай бяспекі. За час вучобы яны рэальна становяцца спецыялістамі, здольнымі самастойна прымаць рашэнні, – адзначае Сяргей Аляксандравіч. – Важную ролю адыгрывае і моўная падрыхтоўка, таму што большасць навуковай і метадычнай літаратуры ў гэтай сферы на англійскай мове.

– У Беларусі 22 973 зарэгістраваныя крыніцы радыяцыйнай небяспекі, таму нашы выпускнікі спецыяльнасці *«ядзерная і радыяцыйная бяспека»* вельмі запатрабаваныя, – распавядае **Марыя ГЕРМЯНЧУК,** намеснік дырэктара МДЭІ ім. А. Д. Сахарава па навуковай рабоце. – Напрыклад, на «Інтэграле», дзе выкарыстоўваецца шмат крыніц іанізуючага выпраменьвання, на іншых прадпрыемствах, дзе працуюць вымяральныя прыборы, заснаваныя на іанізуючых выпраменьваннях. Шмат нашых выпускнікоў працаўладкоўваецца ў такія буйныя фірмы як «Атамтэх», «АДАНІ», «Полімайстар».

БелАЭС

– Нашы выпускнікі ў тым ліку працуюць на Беларускай АЭС, – адзначае Марыя Рыгораўна. – І ў гэтым годзе туды размеркавалі яшчэ 8 чалавек. Падчас пленарнага пасяджэння нядаўніх Сахараўскіх чытанняў у прамым эфіры выступіў намеснік галоўнага інжынера па бяспецы Беларускай АЭС. Ён выказаў сваю пазіцыю па забеспячэнні бяспекі і закрануў важны для нас момант: на станцыі ўжо працуюць трыццаць шэсць нашых выпускнікоў, і ўсе яны маюць высокія прафесійныя дасягненні, іх прафесійнай падрыхтоўцы даюць высокія ацэнкі.

Таксама падчас пленарнага пасяджэння было закранута пытанне, звязанае з забеспячэннем радыяцыйнай бяспекі вакол Беларускай атамнай электрастанцыі. Цяпер на ёй рыхтуюцца да фізічнага пуску першага рэактара, гэта важны перыяд, калі мы ацэньваем радыяцыйны стан вакол станцыі да пачатку эксплуатацыі. Выключная роля нашага інстытута ў тым, што ў нас працуе ***адзіная ў краіне лабараторыя***, якая прафесійна займаецца вымярэннямі трыцыю ў навакольным асяроддзі, вынікі даследаванняў з'яўляюцца асновай для наступных ацэнак уздзеяння атамнай электрастанцыі на прыроду.

Замежныя студэнты

– Інстытут мае філіял у Ерэване, сумесны факультэт у Таджыкскім нацыянальным універсітэце, – распавядае Сяргей Аляксандравіч. – Апошнія 5 гадоў паспяхова рэалізуем адукацыйныя праграмы і ступені вышэйшай адукацыі па схеме 2 + 2 і 1 + 3. У Таджыкістане, напрыклад, вельмі зацікаўлены ў супрацоўніцтве, у іх рэальна ёсць патрэба ў спецыялістах па энергазефектыўных тэхналогіях і энергетычным менеджменце, таму што ў краіне шмат гідраэлектрастанцый, развіваецца сонечная энергетыка. Аднак многім студэнтам цяжка спраўляцца з вучэбнай праграмай, таму што яна патрабуе сур'ёзных ведаў па матэматыцы і фізіцы. На спецыяльнасць *«медыка-біялагічная справа»* ў грамадзян Таджыкістана таксама ёсць попыт, таму будзем развіваць і гэты кірунак. Што тычыцца тэхнічных спецыяльнасцяў, то імі зацікавіўся Узбекістан. У мінулым годзе мы набралі там дзве групы, два гады студэнты будуць вучыцца на радзіме, а потым яшчэ на два гады прыедуць да нас. У нашых планах развіццё дыстанцыйнай адукацыі, шмат што можна перавесці ў дыстанцыйную форму. Калі казаць пра Узбекістан, то нашы партнёры там за год стварылі сур'ёзныя лабараторыі, з якімі дыстанцыйнае навучанне становіцца магчымым. Зараз мы думаем пра стварэнне сумеснага факультэта ў Ташкенце.

У інстытуце ёсць і англамоўныя адукацыйныя праграмы. Напрыклад, у магістратуры па спецыяльнасці *«медыцынская фізіка»* навучаецца група з Ірака. Да нас на трэці курс спецыяльнасці «медыка-біялагічная справа» перавёўся студэнт са Стэнфардскага ўніверсітэта, ён грамадзянін Саудаўскай Аравіі. Магу сказаць, што гэта найлепшы студэнт інстытута. Выкладчыкі адзначаюць, што ў нас яшчэ такога не было, каб чалавек быў так матываваны да вучобы, пастаянна задаваў пытанні.

Новыя сумесныя адукацыйныя праграмы

Інстытут мае шырокую сетку міжнародных кантактаў, дзякуючы якім студэнты выязджаюць на стажыроўкі ў іншыя краіны, праводзяцца навуковыя даследаванні і рэалізуюцца сумесныя адукацыйныя праграмы.

– У гэтым годзе мы адкрываем новыя сумесныя праграмы І ступені з Таразскім універсітэтам (Казахстан), магістарскія праграмы па урбаэкалогіі з Расійскім універсітэтам дружбы народаў, – дзеліцца Сяргей Аляксандравіч. – Для нас гэта новы, але вельмі актуальны напрамак. У РУДН у планах зрабіць гэтую магістратуру сеткавай, да яе праявілі цікавасць шэсць дзяржаў, але пакуль не раскрываецца якія. Цяпер гаворка ідзе пра чатыры краіны-ўдзельніцы, гэта значыць, што, паступіўшы на дадзеную праграму, магістранты будуць навучацца ў чатырох ВНУ.

Інфармацыйныя прадукты

Як будзе развівацца экасістэма ў тым ці іншым рэгіёне, сёння можна прагназаваць, аналізуючы базы даных: раслінная і жывёльная светаў, склад глебы, кліматычныя паказчыкі. Яшчэ адзін напрамак, які развіваюць у МДЭІ імя А. Д. Сахарава – стварэнне новых інфармацыйных прадуктаў. Кафедра інфармацыйных тэхналогій у экалогіі і медыцыне выйграла тэндар і цяпер выконвае заданне Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя па распрацоўцы ***аўтаматызаванай сістэмы анлайн-маніторынгу*** стану кампанентаў навакольнага асяроддзя г. Оршы і Аршанскага раёна, якая будзе запушчана ўжо ў гэтым годзе.

– Мы сабралі і зараз праводзім у базы даных інфармацыю пра экалагічны стан атмасфернага паветра, паверхневых вод, глебаў на тэрыторыі Аршанскага раёна, – распавядае Марыя Рыгораўна. – З пункта гледжання экалогіі гэта складаны раён з вельмі магутнай прамысловасцю і высокімі выкідамі ў навакольнае асяроддзе. Там развітая сельская гаспадарка, таму глебы тэхнагенна ператвораныя вельмі сур'ёзна. Вялікая колькасць насельніцтва пакідае шмат адходаў, адпаведна трэба працаваць з палігонамі цвёрдых бытавых адходаў. Важна адзначыць, што нельга вывучаць усе паказчыкі асобна адзін ад аднаго, толькі ў сукупнасці. Тады мы зможам ацэньваць перспектывы захавання і выкарыстання прыроднага капіталу, дэградацыю альбо стабілізацыю навакольнага асяроддзя, а самае галоўнае – даваць рэкамендацыі для прыняцця рашэнняў. Вельмі важна, што спажыўцом гэтага прадукту будзе не толькі Мінпрыроды, але і Аршанскі райвыканкам, гэта значыць тыя людзі, якім гэтая інфармацыя патрэбна кожны дзень для вырашэння іх паўсядзённых задач. Базы будуць пастаянна абнаўляцца, мы загружаем у іх даныя, якія атрымліваем у рамках Нацыянальнай сістэмы маніторынгу навакольнага асяроддзя – гэта 12 відаў маніторынгу. Цяпер распрацоўваецца Дзяржаўная праграма рацыянальна прыродакарыстання на 2021–2025 гады, мы падалі заяўку на ўдзел у ёй, каб рэалізаваць падобныя праекты яшчэ ў некалькіх рэгіёнах: у Астравецкім раёне, дзе ў спалучэнні з іншымі крыніцамі на навакольнае асяроддзе будзе ўздзейнічаць Беларуская атамная электрастанцыя; у Гомелі і Гомельскай вобласці, дзе выбралі раён блізкі да ПДРЭЗ – складаная тэрыторыя з радыеактыўнымі забруджваннямі. А ў якасці фонавага раёна, з якім мы будзем параўноўваць паказчыкі, выступіць наш унікальны Бярэзінскі біясферны запаведнік.

Сахараўскія чытанні

– Наша традыцыйная канферэнцыя «Сахараўскія чытанні» прайшла 21–22 мая. Сёлета былі 20-я юбілейныя чытанні, якія праходзілі ў складаных умовах з-за пандэміі каранавіруса, – адзначае Марыя Рыгораўна. – Аднак дзякуючы таму, што канферэнцыя праводзілася анлайн, у ёй змаглі паўдзельнічаць даследчыкі, якім досыць складана прыехаць у Беларусь. Напрыклад, у пленарным пасяджэнні прыняў удзел старшыня адміністрацыі раёна Баўтцэн з Германіі з дакладам наконт сёлетняй пандэміі кароны і будучыні вугляроднай эканомікі. Таксама ў рамках чытанняў абмяркоўвалася традыцыйная тэма «Беларусь і Чарнобыль». Па выніках канферэнцыі плануецца выданне матэрыялаў, найбольш значныя з якіх будуць апублікаваныя ў навуковым часопісе ***«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Экалогія»***.

У далейшым мы плануем у часопісе акцэнтаваць традыцыйныя навуковыя напрамкаў асабліваю ўвагу надаваць ацэнцы радыяцыйнай бяспекі вакол Беларускай АЭС. Акрамя таго, у нас з'явіўся партнёр – Інстытут радыеэкалогіі ў Японіі, з якім мы будзем рыхтаваць артыкул з параўнальнымі характарыстыкамі чарнобыльскага і фукусімскага радыеактыўных забруджванняў. У гэтым напрамку мала хто працаваў, і мы спадзяёмся атрымаць вынікі, якія будуць выкарыстаныя і для ацэнкі радыяцыйнага стану вакол Беларускай атамнай электрастанцыі, як аснова для планавання супрацьаварыйных мерапрыемстваў.

Падрыхтавала Валерыя БАНДАРЧЫК

УНІВЕРСІТЭТ
8 чэрвеня 2020 года, № 9 (2231)

Новыя задачы – новы сайт

Працяг. Пачатак на с. 1

Для зручнасці карыстальніка на сайце прысутнічае некалькі відаў пошуку і навігацыі, у тым ліку звыклае для моладзі бургер-меню. Пры гэтым пакінулі тыя сэрвісы, якія сябе добра зарэкамендавалі на папярэдняй версіі сайта: сістэму электронных зваротаў, заказ дакументаў праз формы на сайце, зваротную сувязь.

Пры распрацоўцы сайта выкарыстоўвалася тэхналогія адаптыўнага дызайну, якая дазваляе лёгка ўспрымаць інфармацыю на розных тыпах прылад, падлучаных да сеткі інтэрнэт. У новай дызайн-канцэпцыі сайта рэалізаваны лёгкі і просты для ўспрымання інтэрфэйс, выкарыстоўваліся элементы фірмовага стылю ўніверсітэта. Мы паспрабавалі зрабіць візуальныя погляды сучаснай моладзі: сайт насычаны фатаграфіямі, структурныя кампаненты дынамічныя і інтэрактыўныя. Мелі на ўвазе і той факт, што відэакантэнт займае асаблівае месца ў інфармацыйным полі маладой аўдыторыі, бо перадае больш інфармацыі, чым фота.

Усё гэта дазваляе падкрэсліць асноўныя дасягненні і маштаб БДУ – нацыянальнага адукацыйнага брэнда Беларусі.

Вынікі апытання кітайскіх студэнтаў

Дыяграма 1. **Якім чынам вы шукалі інфармацыю, неабходную для паступлення ў БДУ?**



Дыяграма 2. **Ці была інфармацыя пра паступленне ў БДУ са спісам неабходных дакументаў поўнай і дакладнай?**



Дыяграма 3. **Ці знайшлі вы на сайце ўсю неабходную інфармацыю пра факультэты і спецыяльнасці?**



Усходні вектар

Сайт мае рускую, беларускую, англійскую і кітайскую версіі. Усе версіі ідэнтычныя візуальна і функцыянальна.

З-за таго, што ў нас вучыцца шмат студэнтаў з Кітая, з кожным годам павялічваецца колькасць кітаямоўных карыстальнікаў сайта, а мэтавая аўдыторыя з КНР стала адной з ключавых для нас за мяжой, у сайта БДУ ўпершыню з'явілася паўнавартасная, а не спрошчаная кітайская версія. Яе аўдыторыя – кітайскія абітурыенты і партнёры нашага ўніверсітэта з КНР.

Каб правільна выявіць інфармацыйныя патрэбы карыстальнікаў кітайскай версіі, цэнтр карпаратыўных камунікацый правёў вялікую аналітычную працу: апытанне 150 кітайскіх студэнтаў, юзабіліці-тэсціраванне ранейшай і новай версій, параўнальны аналіз версій сайтаў вядомых універсітэтаў на кітайскай мове, аналіз сучасных тэндэнцый web-дызайну для кітайскіх карыстальнікаў.

У выніку апытання студэнтаў БДУ з КНР было выяўлена, што большая частка студэнтаў выкарыстоўвае смартфоны для пошуку інфармацыі на сайце. Трэцяя частка апытаных студэнтаў лічыць, што інфарматыўнасць сайта важнейшая за яго візуальнае афармленне. Таксама рэспандэнтамі былі выказаныя пажаданні па дадатковай функцыянальнасці сайта, сярод якіх: выкарыстанне радка пошуку, зносіны з работнікамі БДУ, магчымасць абмеркавання пытанняў, якія ўзнікаюць, рэалізацыя на сайце наяўнасці спасылак на старонкі БДУ ў сацыяльных сетках.

Па выніках апытання кітайскіх студэнтаў было выяўлена (студэнты ацэнівалі мінулую версію сайта і сайт упраўлення міжнародных сувязяў):

• інфармацыю, неабходную для паступлення ў БДУ, палова рэспандэнтаў (47,7 %) атрымлівала ад сваіх сяброў і знаёмых, якія вучыліся ці вучацца ў БДУ, 44,4 % шукалі інфармацыю на сайце (дыяграма 1). Гэта гаворыць пра высокую запатрабаванасць размяшчэння актуальнай інфармацыі, неабходнай для абітурыентаў, на сайце;

• нягледзячы на тое, што, на думку вялікай часткі студэнтаў з КНР (48,3 %), інфармацыя, неабходная для паступлення ў БДУ, прадстаўлена на сайце ў поўным аб'ёме і з'яўляецца дакладнай (дыяграма 2), чвэрць апытаных (25,2 %) адзначаюць, што яны знайшлі неабходную для іх інфармацыю, аднак не ўся інфармацыя была актуальная, і 25,8 % не знайшлі неабходную інфармацыю і выкарыстоўвалі іншыя крыніцы для яе атрымання. Таксама вялікія цяжкасці пры пошуку інфармацыі ўзнікалі з-за таго, што яна прадстаўлена не на кітайскай мове, пра што паведамілі 56,3 % рэспандэнтаў (дыяграма 3).

Важнай для кітайскіх карыстальнікаў таксама з'яўляецца інфармацыя пра першых асоб БДУ – рэктара і прарэктараў. Пасля праведзенага апытання на кітайскай версіі сайта з'явіліся дадатковыя старонкі з інфармацыяй пра Беларусь і беларусаў, беларуска-кітайскія ўзаемаадносіны, нашы нацыянальныя традыцыі, клімат, будучыя ўмовы пражывання.

Спадзяёмся, што распрацоўка кітайскай версіі сайта дапаможа актыўнаму прасоўванню адукацыйных і навуковых паслуг, прадуктаў БДУ і яго структурных падраздзяленняў, а таксама брэнда нашага ўніверсітэта на тэрыторыі КНР.

Плён супольнай працы

Сёння сайт паказвае добрую дынаміку паказчыкаў пасля рэдызайну: у параўнанні з папярэднім перыядам павялічыліся такія web-паказчыкі, як прагляды старонак, час на сайце, сярэдняя працягласць сеанса, колькасць карыстальнікаў, улічваючы новых, і інш. Але галоўная ацэнка сайта яшчэ наперадзе – гэта прыёмная кампанія, у тым ліку для замежных абітурыентаў.

Над актуалізацыяй інфармацыі сайта працуюць больш за 100 рэдактараў з усіх падраздзяленняў.

Таццяна ЗАЙКОЎСКАЯ, начальнік ЦКК



Для эфектыўнага асваення новай сістэмы кіравання кантэнтам быў праведзены навучальны вэбінар

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

03 чэрвеня Круглова Галіна Анатольеўна, прафесар кафедры паліталогіі

06 чэрвеня Варановіч Ігар Іванавіч, дацэнт кафедры вышэйшай алгебры і абароны інфармацыі

07 чэрвеня Бурава Святлана Нікіфараўна, дацэнт кафедры сацыялогіі

11 чэрвеня Пятрова Наталля Сямёнаўна, дацэнт кафедры рэгіянальнай геалогіі

15 чэрвеня Буза Міхаіл Канстанцінавіч, прафесар кафедры шматпрацэсарных сістэм і сетак

16 чэрвеня Сахвон Віталь Валер'евіч, намеснік дэкана па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях, біялагічны факультэт

18 чэрвеня Жданоўскі Аляксандр Паўлавіч, дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі навукі

18 чэрвеня Ніжнёва Наталля Мікалаеўна, прафесар кафедры англійскага мова-знаўства

24 чэрвеня Лукашоў Алег Валянцінавіч, загадчык кафедры рэгіянальнай геалогіі

27 чэрвеня Гужалоўскі Аляксандр Аляксандравіч, прафесар кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў

АБ'ЯВЫ

ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А. Н. СЕЎЧАНКІ БДУ

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

СТАРШАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА па спецыяльнасці «оптыка»;

НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА па спецыяльнасці «оптыка».

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Дакументы накіроўваць на адрас: Мінск, вул. Курчатава, 7, тэл. (+375 17) 212-48-43.

БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

Педагагічная майстэрня анлайн-навучання стартавала ў БДУ – БелТА, zviazda.by, «Інтэрфакс», «Экапрэс», radiostalica.by, yandex.by, 1prof.by (11.05), АНТ (12.05).

«Часопіс БДУ. Матэматыка. Інфарматыка» ўключаны ў базу даных Scopus – БелТА, sb.by, zviazda.by, yandex.by (27.05), БТ-1, Беларусь-24 (28.05).

У БДУ арганізавана вытворчасць расходных матэрыялаў для ўстаноў аховы здароўя – БелТА, sb.by, zviazda.by, radiostalica.by (06.05), chyvonka.by (07.05), АНТ (13.05).

Электронная бібліятэка БДУ захавала статус лідара ўніверсітэцкіх рэпазітарыяў Еўропы – «Экапрэс» (05.05), БелТА, sb.by, zviazda.by, «Інтэрфакс», yandex.by (06.05), «Звязда» (12.05).

Пачатак прыёму дакументаў у Ліцэі БДУ – «Мінск-Навіны» (07.05), БелТА, sb.by, zviazda.by, «Спадарожнік», aif.by, radiostalica.by, radiomir.by (08.05), «Звязда», Tut.by (12.05).

Дзень дзіцячай журналістыкі ў БДУ – БелТА, dompressy.by, (12.05), «Мінск-Навіны», adu.by (14.05), vileyka-edu.gov.by (13.05).

Конкурс стартапаў Startup Heart арганізаваны ў БДУ – БелТА (12.05), zviazda.by, БТ-1, «Экапрэс», news.21.by (13.05).

Пра Тыдзень сям'і ў БДУ – БелТА, sb.by, «Мінск-Навіны», yandex.by (09.05), БТ-1 (15.05).

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

УНІВЕРСІТЭТ
8 чэрвеня 2020 года, № 9 (2231)

УНІВЕРСІТЭТ
8 чэрвеня 2020 года, № 9 (2231)

Фота Яўгена ПАЎЛЮЧКА

Аркадзь Брыш падчас візіту ў БДУ 21 чэрвеня 2007 г.



Тав. А. Брыш, разведчык штаба партызанскай брыгады імя К. Я. Варашылава



БОЕВАЯ ХАРАКТЕРИСТИКА.

на разведчика Штаба Партизанской Бригады им.Ворошилова тов.БРЫШ Аркадия Адамовича.

тов.БРЫШ А.А. рождения 1917 года, белоруса, член ВЛКСМ с 1931 года, вступил в ряды партизан в декабре 1941 года и работал в качестве опытного-разведчика выполнял ряд заданий по сбору разведданых о численных противника, дислокации частей противника, а также организовывал отправку людей в партизаны.

тов.Брыш А.А. организовал в г.Минске подпольную группу в количестве 5 человек, выполнявшую задачи: прием, передачу нелегального радио-сообщение, построил и достоверно сообщил радиопризывы о общих налетах.

тов.Брыш организовал вывозку из г.Минска партизанскую бригаду,большого количества боеприпасов, оружия, пищущее машинки, медикаментов, одежды и масс.газ для подрывных типографии, а также различных разведданых о противнике.

В последнее время т.Брыш занимал должность разведчика Штаба Партизанской бригады им.Ворошилова.

Работая в разведке т.Брыш завоевал большой авторитет среди партизан и среди населения в зоне действия партизан, как опытного и отважного разведчика.

Участвовал во всех боях проведенных бригадой, а также ходил с группами на боевые задания, где вел себя смело и решительно без колебаний.

Так он участвовал 14.VII-43г. в разгроме вражеского заслона на мосту Минск-Чаусы, в Осиповичском бою в июле 1944г. в рейдовом бою на железно дорожном узле Осиповичи-Серебрянка 26-го июля 1944 года и других боевых операциях.

На своем боевом счету т.Брыш имеет 6 убитых фашистов и одного взял в плен, доставил в бригаду с винтовкой, 2 автоматами, 2 пистолетами, 22 гранат, 2 м.с.патронов, подорвал в бою пробил: 8 железнодор. путей, 4 автомат, 15 гранат, 1240 патронов.

т.Брыш исполнительный и смелый разведчик. Имеет ряд благодарностей от командования бригадой.

За доблесть и мужество проявленные в борьбе против немецко-фашистских захватчиков награжден правительственной наградой - медалью "Партизану Отечественной войны" I- степени. Представлен к награждению медалью "За боевые заслуги".

Командир Партизанской
бригады им.Ворошилова Минской
области (Бременко В.Г.)

Начальник отдела кадров
Военно-политического партизанского
движения при
подполковник

Баявая характарыстыка на разведчыка штаба партызанскай брыгады імя К. Варашылава тав. Брыша Аркадзя Адамавіча

А. Брыш разам з сябрамі-партызанамі Ф. Кампаніцам і Л. Путанам

А. Брыш вітаецца з Л. Толсцікам, В. Анішчыкам і А. Фядотавым

Аркадзь Брыш – адзін з бацькоў савецкага «атамнага шчыта»

Брыш – легенда атамнай галіны

Аркадзь БРЫШ – адзін з выбітных канструктараў XX стагоддзя, стваральнікаў ядзернай зброі. З яго ўдзелам распрацаваны шматлікія ядзерныя боепрыпасы, бартавыя прыборы аўтаматыкі і сістэмы кантролю. Сам навуковец заўсёды падкрэсліваў: «Мы стваралі бомбу дзеля міру». Пра такіх людзей да 1980-х нідзе не пісалі, ніхто не ведаў, чым яны займаюцца. Усё з-за сакрэтнасці службы. Навуковец-ядзершчык – выхадзец з нашага ўніверсітэта. Ён атрымаў дыплом БДУ 80 гадоў таму.

«А якія кросы ў студэнцкія гады мы ладзілі!»

Аркадзь Адамавіч нарадзіўся ў Мінску 14 мая 1917 года. Яго сям'я – бацька (настаўнік фізікі), матуля і тры браты. У дзяцінстве, як і многія іншыя хлапчукі, хацеў стаць лётчыкам. Але мара не спраўдзілася – падвяло блізарукае левае вока. У 14 гадоў паступіў у школу электраманцёраў. А ўжо ў 16 стаў працаваць па спецыяльнасці ў вячэрняй школе Заходняй чыгункі, адначасова атрымліваў адукацыю ў старэйшых класах на вячэрнім аддзяленні школы № 25. Праз два гады паступіў на фізічны факультэт БДУ. Пра перыяд студэнцтва ў кнізе ўспамінаў ён піша:

– Калі пачаў вучыцца, адчуваю, што нічога не разумею. Але да першай заліковай сесіі сабраўся, потым асвоіўся, і пайшла вучоба. Ва ўніверсітэце вельмі актыўна займаўся спортам, быў старшынёй рэспубліканскага спартыўнага таварыства. Яно размяшчалася ў доме прафсаюзаў, у мяне быў свой кабінет і нават падначаленыя. Корпус фізмата знаходзіўся ад галоўнага корпуса прыкладна метрaў за дзвесце, і ў перапынках паміж лекцыямі я бегаў да галоўнага корпуса. Студэнты гаварылі, што я нібы на крылах лётаў. Калі дасягнеш дасканаласці, то ад бегу таксама можна атрымліваць велізарнае задавальненне. Я трэніраваў студэнтаў у універсітэта, вучыў катацца, спускацца з гары, яны гэтага зусім не ўмелі. Так што паступова каманда ўніверсітэта стала выхадзіць у гарадскія спаборніцтвы па розных відах спорту на першыя месцы. А якія кросы ў студэнцкія гады мы ладзілі! Усё гэта рабілі з задавальненнем, без прымусу.

З жонкай Любоўю Майсеёўнай Брыш пазнаёміўся яшчэ ў 10-м класе. Адноўчы на камсамольскім сходзе, на якім яго абралі камсаргам, у дварах школы загарэлася вартоўня. Ён ускочыў на падпалены дах, яму падавалі ваду, а ён заліваў агонь. Тут яшчэ адна дзяўчына залезла на дах і пачала дапамагаць. «Пасля гэтага пажару мы сталі героямі, дырэктар выдаў нам прэміі, – успамінаў Аркадзь Адамавіч. – А на смелую дзяўчыну я звярнуў увагу. Пачаў з ёй сустракацца, хадзіць у кіно. Дапамагаў ёй рыхтавацца да паступлення на геаграфічны факультэт БДУ. На 4-м курсе пажаніліся. Жылі мы добра. У ёй было шмат якіцэйвай мудрасці».

Дыплом БДУ ён атрымаў у 1940 годзе, пасля працаваў у Інстытуце хіміі Акадэміі навук БССР. Спачатку лабарантам, а потым малодшым навуковым супрацоўнікам. Але, калі пачалася вайна, акадэмію эвакуявалі, ранейшае жыццё скончылася.

«Перамагчы страх смерці можна верай»

Дарэчы, напачатку вайны ўніверсітэцкія веды дапамагалі яму выжыць. Па Мінску немцы развесілі аб'явы, у якіх гаварылася, каб людзі прыходзілі на назначаны адрас на праверку. Ён пайшоў, вырашыў, што яго праверацъ і адпусцяць. Але ўсіх, хто з'явіўся, паставілі ў калону і павялі на ўсход ад горада ў лагер. Там утрымлівалі больш за суткі без ежы і вады. Аркадзь Адамавіч успамінаў:

– Праз некаторы час аб'явілі, што ўрачоў адпускаюць. Я вырашыў на гэтым сыграць. Па-нямецку кажу, што я доктар. Да які ж я доктар? Дапамагло адзінае тое, што, калі вучыўся ва ўніверсітэце, працаваў на рэнтгенаўскай устаноўцы. Я немцам гавару: «Рэнтген». Калі б высветлілася праўда – расстралялі б. А так мяне выпусцілі з лагера.

Калі нямецка-фашысцкія войскі ўвайшлі ў Мінск, Брыш далучыўся да падпольнай групы, якая аказвала супрацiўленне акупантам. Група займалася зборам разведданых пра нямецкія гарнізоны, дастаўляла ў размяшчэнне партызан медыкаменты, зброю, боепрыпасы, абсталяванне для друкарні. Аркадзь Брыш здзейсніў подзвіг – вывез з акупаванага Мінска сейф з рукапісамі Якуба Коласа, закапаў яго ў сваім дварэ і тым самым выратаваў спадчыну вялікага пісьменніка. Тым больш што з сям'ёй Коласа сябраваў бацька Брыша. А пад канец 1941 года ён пайшоў у партызанскую брыгаду імя К. Я. Варашылава, якая дзейнічала ва Уздзенскім раёне Мінскай вобласці, стаў разведчыкам брыгады. Пра адзін ваенны эпізод ён распавядаў так:

– Мы блізка знаходзіліся ад нямецкіх гарнізонаў і ўвесь час рызыкавалі. А я да таго ж даволі часта хадзіў у разведку. У атрадзе каціраваліся смелыя людзі, і я адразу для сябе вырашыў: трэба ці быць смелым, ці адразу ісці працаваць на кухню. 14 чэрвеня 1944 года – гэты дзень я ніколі не забуду. Мы адправіліся на разведку ў Нясвіжскі раён. Калі наблізіліся да памежнай зоны, адна жанчына, у якой муж быў у партызанах, папярэдзіла, што тут шмат немцаў. Нас гэта не спалохала. Ехалі даволі хутка па краі поля і наткнулісятакі на засаду, якая яшчэ не арганізавалася. Немцы пачалі страляць. Стрэлаў не чую, толькі бачу агеньчыкі. Нашы коні на дыбы, я – на зямлю… Што дзіўна, нас нават не параніла. І каня свайго я потым знайшоў. Прыкладна кіламетр ішоў пешшу, а потым сустрэў сваю Ластаўку і далей у атрад вяртаўся ўжо ў сядле.

Аркадзь Брыш і ў вызвалены Мінск прыехаў на сваёй Ластаўцы. Больш за тое, з ёй удзельнічаў у парадзе 16 ліпеня 1944 года. Іх зборны конны атрад замыкаў усё дзеянне. Ён без раненняў прайшоў вайну, але, па асабістых падліках, разоў дваццаць быў на валаску ад смерці. За доблесць і мужнасць А. А. Брыш узнагароджаны медалямі «Партызану Айчыннай вайны» 1 ступені і «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.», ордэнам Чырвонай Зоркі. Пазней пра вайну ён казаў:

– Што такое адвага, я даведаўся падчас вайны. Я думаю, што перамагчы страх смерці можна пераканаўшы, верай у шчасьці значнае, сапраўднае. Гэта рыса – быць не апошнім, а ў ліку першых – захавалася на працягу ўсяго майго жыцця. І ў партызанах так было. Заўсёды хацелася лезці на ражон, паказаць, што смелы і нічога не баюся. Хоць насамрэч было страшна. Можа, для пераадолення гэтага страху я залішне рызыкаваў.

Яго самым буйным поспехам стала рэалізацыя ідэі пра тое, каб зрабіць нейтронны ініцыятар для атамнай бомбы («запалку», якая запускае ланцуговую рэакцыю, што прывядзіць да ядзернага выбуху) не ўнутры сферы з плутонію, а звонку. Гэта ідэя здавалася немагчымай. Лічылася, што схема будзе вельмі масіўнай і зойме цэлае памяшканне, хоць бомбу яшчэ трэба неяк падняць на самалёт, ракету. Але Брыш умеў давесці да розуму невырашальныя распрацоўкі. І ў выніку сапраўды атрымалася стварыць мініяцюрную крыніцу нейтронаў. Так магутнасць выбуху ўзрасла ў некалькі разоў, а маса зараду істотна паменшылася. Пасля паспяховага выпрабавання ў наступным 1955 годзе А. А. Брыш быў пераведзены ў Маскву, у філіял № 1 КБ-11 (Усерасійскі навукова-даследчы інстытут аўтаматыкі імя М. Л. Духава – УНДІА) намеснікам галоўнага канструктара.

Адзначым, што траціна ядзерных боепрыпасаў, распрацаваных у СССР, створана з удзелам Аркадзя Брыша. Ён запісаў у кнігу ўспамінаў: «Памятаю, калі ў 1955 годзе завяршалі працу над тэрмаядзернай бомбай, мне так хацелася, каб усё добра атрымалася, што я хадзіў і гладзіў бомбу. Аўтаматыку, якая ў ёй выкарыстоўвалася, я праяраў на лётных выпрабаваннях на Керчанскім палігоне. Шмат сіл я ўклаў у яе». І падкрэсліваў: «Мы рабілі гэта не для вайны, а для падтрымання міру».

Калегі Брыша адзначалі яго мэтанакіраванасць і выключную творчую актыўнасць. Ён захапляў і заражваў навакольных сваімі ідэямі. Кажуць, Андрэй Сахараў жартам нават прапанаваў увесці адзінку дзелавой актыўнасці – «адзін Брыш». Але ўсе разумелі, што гэта была недасягальная велічыня. Таму звычайна карысталіся малымі адзінкамі – «мілiБрышам» ці «мікраБрышам».

Шматлікія працы навукоўца былі ўнікальныя і развіліся ў самастойныя навуковыя школы і напрамкі. З 1964 па 1997 гг. А. А. Брыш быў галоўным канструктарам УНДІА. Пад яго кіраўніцтвам распрацаваны і перададзены ў серыйную вытворчасць многія ўзоры высокаэфектыўных ядзерных боепрыпасаў. Тэарэтычныя і эксперыментальныя працы ляглі ў аснову новых вырабаў і прыборaў, якія забяспечылі прагрэс ядзернай зброі. Ён вёў важную навуковую працу па павышэнні бяспекі ядзерных боепрыпасаў. Пасля Аркадзь Адамавіч займаў пост ганаровага навуковага кіраўніка УНДІА.

«Пражыўшы жыццё, разумею, што тыя метады сябе апраўдалі»

Легенда атамнай галіны, доктар тэхнічных навук, прафесар Аркадзь Брыш сышоў з жыцця на 99 годзе. Адноўчы ён адзначыў: «Заўсёды ўдавалася атрымаць адказ на самае, як здавалася спачатку, невырашальнае пытанне. Мяне гэта радавала і запэўнівала ў тым, што можна і далей браца за складаныя пытанні і знаходзіць на іх адказы. Вядома, не аднаму, а разам з калектывам, які неабходна захапіць, быць патрабавальным да яго. Цяпер, пражыўшы вялікае жыццё, я разумею, што гэтыя метады сябе апраўдалі. Калі будзеш шмат думаць, даследаваць, разбіраца, то задача будзе вырашана, пры ўмове, вядома, што яна правільна сфармулявана і не супярэчыць законам прыроды». Жонка Брыша Любоў працавала ў адной з лабараторый таго ж КБ-11. Яна зрабіла чатыры палоніева-берыліевыя крыніцы для першай бомбы і атрымала прамянёвую хваробу. Але вытрымала і пражыла 82 гады.

Вялікі навуковец Брыш ганараваны званнем Героя Сацыялістычнай Працы, ён лаўрэат Ленінскай і Сталінскай прэмій, прэміі Урада РФ, узнагароджаны чатырма ордэнамі Леніна, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Айчыннай вайны II ступені, расійскімі ордэнамі Пашаны і «За заслугі перад Айчынай» IV ступені. Яму прысвоена званне «Заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі РФ».

З Беларуссю ён не расставаўся, часта з сям'ёй падарожнічаў па родных месцах. У яго і ў маўленні захавалася шмат характэрных беларускіх слоўцаў. Ён успамінаў адно з пасяджэнняў у Хрушчова. Апынуўся побач з Анастасам Мікаянам, а той спытаў, хто ён такі. «Я разгубіўся, і кажу: „Беларус“». З радзімай Брыша звязвалі і ваенныя сябры, і аднакурснікі. Заўсёды імкнуўся прыехаць і на дзень вызвалення Мінска, гэта было вельмі значнае для яго свята. Не забываў Брыш і пра сваю альма-матар. «Беларусы, – гаварыў ён, – акуратны, мірны народ. Гэтыя людзі пражылі вайну і не будуць без патрэбы задавацца».

Падрыхтавала Алена ЛЯЎШЭНЯ

СЛОВА КАЛЕГАМ

Віктар АНІШЧЫК, прафесар фізічнага факультэта БДУ:

– Аркадзь Адамавіч з тых людзей, якія рабілі вялікія справы. І ён не моцна пра гэта задумваўся. Ведаў, што такі яго абавязак. Я пазнаёміўся з Аркадзем Адамавічам у канцы 90-х падчас яго прыезду на факультэт. Калі я быў дэканам (1997–2018 гг.), мы прымалі яго ў БДУ адзін ці два разы ў год. Яму было цікава на родным факультэце, любіў сустракацца з навукоўцамі, выкладчыкамі, студэнтамі. Ён быў надзвычайным суразмоўцам, заўсёды выступаў перад моладдзю. Тыя лекцыі слухалі са шчырай цікавасцю. Ён распавядаў пра фізіку, жыццё, калегаў. Яго словы натхнялі тых, хто сумняваўся і не мог выразна вызначыць сваё месца ў навуцы. Яму часта задавалі каверзныя пытанні, але ён не пазбягаў адказу. У сваю чаргу, яго цікавіла моладзь і яе погляды, яму было не ўсё адно, у чыіх руках будучыня краіны. Ён ацаніў рэканструкцыю фізічнага корпуса. Яму паказалі лабараторыі, аўдыторыі. Дарэчы, на факультэце ў 2013 годзе была адкрыта імянная аўдыторыя А. А. Брыша.

Яго разважлівасць выклікала павагу. У звычайнасці і прастаце прамалёўвалася значнасць асобы. Ён быў чалавечным. Не павышаў голас, калі ўздымаўся градус дыскусіі. Выразна адстойваў свой пункт гледжання і аргументаваў яго. І практычна ніколі не прайграваў.

Ён зрабіў вельмі шмат для савецкай навукі. На сустрэчах з абітурыентамі мы абавязкова распавядаем пра нашага знакамітага выпускніка. Ён і яго калегі ўнеслі вялікі ўклад у развіццё атамнай галіны і абароны Савецкага Саюза. Яго асоба вельмі значная для фізфака, Беларусі, свету.

Яўген ПАМЫТКІН, выпускнік фізфака 1983 года:

– Студэнтамі мы вучыліся ў выкладчыкаў, якія прайшлі суровымі дарогамі вайны. У камітэце камсамола вялі пошукі, адраўлялі партызанскія помнікі, сустракаліся з ветэранамі. У Лаўскім лесе на тэрыторыі Уздзенскага раёна сіламі студэнтаў БДУ былі адноўлены партызанскія зямлянкі. І ў маі 1981 г. пад кіраўніцтвам А. Рухлі арганізавалі сустрэчу ветэранаў-партызанаў брыгады імя Варашылава, якая дзейнічала ў Мінскай вобласці. Сярод запрошаных быў і Аркадзь Адамавіч Брыш. На ўсё жыццё запомнілася тая сустрэча. Калі слухалі аповеды ветэранаў у тых месцах, дзе яны ваявалі, ішлі разам з імі партызанскімі сцежкамі, то кожны з нас разумеў і адчуваў вялікае значэнне Перамогі.

Другі раз мы сустрэліся на 60-годдзі БДУ. Я тады вучыўся на 3 курсе, але мне пашчасціла суправаджаць Аркадзя Адамавіча, ізноў пачуць яго аповеды пра вучобу ва ўніверсітэце і, безумоўна, пра Вялікую Айчынную вайну. Ён вельмі любіў Мінск, асабліва часта ўспамінаў беларускія бярозы, слухаў песні пра родную Беларусь у выкананні «Песняроў».

На жаль, з прычыны спецыфікі працы не часта атрымлівалася прыязджаць у родныя месцы, але кожны раз знаходзіў нагоду для сустрэч з баявымі таварышамі. Мы прыязджалі ва Уздзенскі раён, там у Аркадзя Адамавіча застаўся добры сябар Фёдар Кампаніец. Вам не перадаць, як у іх гарэлі вочы, калі яны ўспаміналі падзеі ваеннага часу, якія разам перажылі. Асабліва на месцах партызанскіх стаянак, на беразе ракі Нёман, як быццам не было за плячыма столькі гадоў. На адной з апошніх сустрэч у 2007 г. была зроблена выдатная фатаграфія. Тры сябры, тры баявыя таварышы зноў сустрэліся, як на здымку ў далёкім 1944 г.

На жаль, не ўсе дажылі да Дня Вялікай Перамогі. Таму кожны раз, прыязджаючы на месцы баявой славы партызанскай брыгады Варашылава, мы ля помніка партызанам у Лаўскім лесе хвілінай маўчання шанавалі тых, хто загінуў, абараняючы Радзіму.

З самага пачатку вайны Аркадзь Адамавіч быў адным з першых падпольшчыкаў Мінска, якія пад кіраўніцтвам А. Ф. Верамейчык ажыццяўлялі сувязь з партызанамі і падпольнай партыйнай арганізацыяй. У адзін са сваіх прыездаў у Мінск ля помніка пакараным 26 кастрычніка падпольшчыкам У. Шчарбацэвічу, К. Трусу, М. Брускінай ён распавёў, што ўзначаленая им група з 8 чалавек арганізоўвала нелегальнае праслухоўванне радыёперадач з Масквы. Ён сам асабіста сабраў радыёстанцыю і аддаў партызанам. У снежні 1941 г. пасля шматлікіх арыштаў членаў Мінскага падполля прыйшлося сысці да партызанаў.

Аркадзь Адамавіч шмат распавядаў пра Героя Савецкага Саюза Марата Казея, яны былі ў адной партызанскай брыгадзе. Брыш паказваў фатаграфію 15-гадовага Марата на кані, зробленую незадоўга да гібелі юнака.

Яго захапленне фатаграфіяй на вайне – гэта асобная тэма. Пры дапамозе фотаапарата Аркадзь Адамавіч рабіў фальшывыя дакументы, якія дапаглі выратаваць жыцці многім людзям. Ва ўНДІА зараз захоўваюцца каля 300 здымкаў аўтарства Брыша. І ўсе яны розныя: і побыт партызанаў, і баявыя дзеянні, і акупаваны Мінск. Ён любіў здымаць, адлюстроўваў ваенную рэчаіснасць.

А. А. Брыш вельмі цёпла ставіўся да роднага ўніверсітэта і да ўсяго, што тычылася альма-матар. Памятаю, як адноўчы ў 1982 г. мяне накіравалі ў Маскву для збору архіўнай інфармацыі пра Льва Андрэевіча Арцімовіча (таксама выдатны выпускнік БДУ, фізік-акадэмік, займаўся праблемамі кіраванага тэрмаядзернага сінтэзу). Задача была цяжкай. Сабрацъ гэты матэрыял дапамог А. А. Брыш. Пасля яго гутаркі з кіраўніцтвам Курчатаўскага інстытута Б. Б. Кадомцавым універсітэту была перададзена мадэль устаноўкі такамак.

Сям'я Брышаў была вельмі гасцінная. Падчас камандзіровак у Маскву я часта спыняўся ў іх ці проста заходзіў у госці. Аркадзь Адамавіч і Любоў Майсеёўна заўсёды былі рады любой вестачцы з Беларусі. І я заўсёды імкнуўся пацешыць іх прыгожымі фота з відамі Мінска. Для іх гэта было вельмі важна, бо чалавек павінен быць звязаны са сваёй Радзімай! Я кожны год прыходжу на Козыраўскія могілкі ў Мінску, дзе пахаваны бацька і маці Аркадзя Адамавіча, прыводжу ў парадак агароджы. І ўпэўнена зноў звяртаюся да свайго Настаўніка, у якога навучыўся не баяцца цяжкасцяў і вырашаць, здавалася б, невыканальныя задачы.

УНІВЕРСІТЭТ
8 чэрвеня 2020 года, № 9 (2231)

Памяць герояў

117 баявых вылетаў авіяцыйнага бортмеханіка Аляксандра Аўданіна

У мінулым нумары газеты мы прывялі ўспаміны супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ пра сваіх бацькоў і дзядоў, якія ваявалі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Яшчэ пра аднаго героя нам расказала Эльвіра АЎДАНІНА, вядучы інжынер кафедры ядзернай фізікі фізічнага факультэта.

– Мой бацька ***Аляксандр Іванавіч Аўданін*** нарадзіўся 14 красавіка 1915 года ў горадзе Кондрава Смаленскай вобласці ў вялікай шматдзетнай працоўнай сям'і. У яго было два браты і тры сястры. Бацька быў дапытлівым, захопленым тэхнікай маладым чалавекам. У свае дваццаць гадоў кіраваў брыгадай па рамонце «фордаў», у гэтым жа ўзросце паступіў у авіяцыйную школу Іркуцка.

У шэрагах Чырвонай арміі ён лічыўся кадравым ваенным з 1935 г. пасля прызыву Жданаўскім РВК Масквы. Да пачатку ВАВ бацька ўдзельнічаў у лакальным узброеным канфлікце з Японіяй, які доўжыўся з вясны па восень 1939 г. на мангольска-маньчжурскай мяжы. Авіяцыя ўнесла немалы ўклад у гэту перамогу. Толькі за 24 і 25 жніўня (калі ішлі заключныя бітвы) бамбардзіроўшыкі СБ здзейснілі 218 баявых групавых вылетаў. За баі на Халхін-Голе бацьку ўзнагародзілі медалём «За адвагу».

Аляксандр Аўданін, 1943 г.

У Вялікай Айчыннай вайне ён удзельнічаў з самага пачатку. У авіяцыйную эскадрыллю 12 гвардзейскага авіяпалка далёкага дзеяння прыбыў у снежні 1942 г. на пасаду бартавога механіка. У наступным годзе яго вайсковая частка 15404 размяшчалася на тэрыторыі Монінскага авіягарнізона (тэрыторыя Ваенна-паветранай акадэміі імя Ю. А. Гагарына, Шчолкаўскі раён Маскоўскай вобласці). Лётаў на самалёце ТБ-3, потым на самалёце Іл-2. За ўвесь час Аляксандр Іванавіч мае 97 баявых вылетаў уначы і 20 баявых вылетаў удзень (у тым ліку транспартаванне параненых байцоў і камандзіраў Сталінградскага фронту). Мяркуючы па характарыстыках, якія складалі на яго камандзіры, бацька быў дасведчаным, умелым спецыялістам і годным мужным воінам. За выдатнае выкананне баявых заданняў у ліпені 1943 г. бацька быў прадстаўлены да ордэна Айчыннай вайны 2 ступені.

У верасні, пасля выканання баявога задання ў раёне Обухава Маскоўскай вобласці самалёт С-47 пацярпеў катастрофу. Загінуў мой бацька (яму было 28 гадоў), бортмеханік гвардыі старшы тэхнік-лейтэнант, а таксама камандзір экіпажа старшы лейтэнант *А. В. Церахаў*, лётчык гвардыі малодшы лейтэнант *А. Ф. Шылаў*, стралок-радыст малодшы сяржант *М. В. Кулікоў*.

У паведамленні пра смерць, якое прыйшло сям'і ў далёкі горад Іркуцк, адзначалася, што «...Аўданін А. І., верны вайсковай прысязе, праявіўшы гераізм і мужнасць у баі за Сацыялістычную Радзіму, загінуў пры выкананні баявога задання ў ноч з 10 на 11 верасня 1943 года ў барацьбе з германскім фашызмам». А крыху пазней, 24 лістапада, прыйшоў ліст з вайсковай часткі 15404 за подпісам ад'ютанта эскадрыллі гвардыі старшага лейтэнанта Чарнова: «...У адказ на гібель нашага сябра і таварыша злосць і нянавісць люта кіпіць у нашых сэрцах; мы будзем яшчэ бязлітасней бамбаваць асіныя гнёзды нямецкіх фашыстаў... Слова гвардзейцаў...».

У 2005 г. пры садзейнічанні адміністрацыі п. Моніна і ваеннага камісарыята г. Шчолкава сям'і дазволілі ўсталяваць помнік бацьку на могілках авіягарнізона. На ўрачыстым адкрыцці мемарыяла былі прадстаўнікі Ваенна-паветранай акадэміі імя Ю. А. Гагарына.

Запісала Алена ЛЯЎШЭНЯ

Без тэрміну даўнасці

Гістфак здымае дакументальныя фільмы пра БДУ ў часы вайны

Сваю кінаспецыялізацыю гістарычны факультэт адкрыў у маі двума дакументальнымі фільмамі пра ваенную гісторыю ўніверсітэта. Вялікая падрыхтоўка, захапляльныя спецэфекты і прадуманая драматургія – няма сумневаў у прафесійнасці гатовых прац. Як склалася здымачная каманда і, самае галоўнае, які пасыл у фільмаў? Для вас даведалася газета «Універсітэт».

Гістарычныя фільмы – справа гістарычнага факультэта

Гатовыя відэа выкладваюцца на Youtube-канале гістарычнага факультэта ў свабодным доступе, і такая адкрытасць – прынцыповая пазіцыя кіраўніцтва. Да гэтага на канале выпускалі запісы лекцый, прамаролікі і замалёўкі студэнцкага жыцця. Ідэя стварэння гістарычных фільмаў належыць Аліне ВЕРАМЕЙЧЫК, намесніку дэкана па вучэбнай і выхаваўчай рабоце:

– Чалавек, які не ведае сваю гісторыю, не ведае сябе. Гэта тыя прабелы ў гісторыі, якія на сёння не запоўнены. Справа гонару гістарычнага факультэта іх папоўніць, бо перыяд Вялікай Айчыннай у жыцці БДУ самы недаследаваны. Да 75-годдзя Перамогі ў нас назапасіўся вялікі навуковы багаж матэрыялаў, а да яго далучылася наша агромністае жаданне запоўніць прабелы. Так з'явіўся фільм ***«Гістарычны факультэт дарогамі вайны»***.

Стварэнне фільма заняло 2,5 года, з якіх 2,5 месяца – мантаж чатырох версій. Яго выконваў Сяргей ВАЙТОВІЧ, загадчык лабараторыі тэхнічных сродкаў навучання. Шэф-рэдактарам выступіў прафесар Алег ЯНОЎСКІ, які прафесійна вычытаў сцэнарый, скарэкціраваў гістарычныя недакладнасці. Усе фатаграфіі, прадстаўленыя ў фільме, архівы ўніверсітэцкія, не скарыстана ніводнага проста «ваеннага» фота. Падборам і паляпшэннем фатаграфій займаўся загадчык лабараторыі Дзмітрый БУЗУН, агучкай – студэнт Віктар ДЗЯДКОЎ.

Другі фільм ***«Наша памяць – без тэрміну даўнасці»*** зняты як экскурсія па фондзе рэдкіх выданняў Фундаментальнай бібліятэкі БДУ. Відзалекцыя прысвечана кнігам, якія выдаваліся падчас вайны ў СССР: якія і для каго, пра кніжныя серыі, пра асобныя рэдкія і каштоўныя асобнікі, іх асаблівасці. Вядучых двое – Алена КІНЧЫКАВА, загадчыца аддзела гуманітарна-асветніцкай працы і папулярызацыі кніжных помнікаў Фундаментальнай бібліятэкі БДУ і студэнт 4 курса гістфака Аляксандр ПАРШАНКОЎ, які сам піша вершы і нават выдаў свой паэтычны зборнік.

Вось-вось пачнуцца здымкі трэцяга ***фільма пра выбітных людзей БДУ***, пахаваных на Ваенных могілках Мінска. Сцэнарый распрацоўвае студэнт гістарычнага факультэта Юрый ТАМКОВІЧ:

– Напачатку вясны ўзнікла ідэя зрабіць экскурсію па Ваенных могілках: яны маюць цікавую гісторыю, тут пахаваны выкладчыкі і людзі, звязаныя з БДУ. Я падрыхтаваў экскурсію, аднак ажыццявіць яе можна будзе толькі ў новым навучальным годзе, а вось зняць відэа мы вырашылі цяпер.

У ім будзе закранута гісторыя Ваенных могілак, царквы – помніка архітэктуры, падрабязна раскасана пра жыццё і ўнёсак выкладчыкаў і людзей, звязаных з БДУ, якія там пахаваны. Такіх персаналій на могілках дзесяць, сярод іх народны пісьменнік Якуб Колас, рэктар Парфён Савіцкі, дэкан хімфака Аляксандр Будкевіч, дэкан медфака Сяргей Мелкіх. У кнігах «Інтэлектуальная эліта Беларусі» Алега Яноўскага і «БДУ ў біяграфіях яго рэктараў» апісаны іх жыццёвыя шляхі. Як прызнаецца Юрый, праца няпростая, прыйшлося пакапацца ў архівах.

– Галоўная ідэя фільма ў тым, што цярпавінны забываць пра папярэднікаў. Не толькі памятаць імя, пасаду і ўнёсак, але і ведаць, дзе яны пахаваны, каб прыйсці і прыбраць магілу, успомніць пра іх.

Вядучая Алена Кінчыкава

Вядучы Аляксандр Паршанкоў

Рэжысёрскія задумкі

Паспяховы старт натхніў адміністрацыю факультэта на працяг. Напарадзе – стварэнне відэасцыкла «Памяць і слава!» да стагоддзя БДУ ў выглядзе лекцый-экскурсій, прысвечаных памяці прафесарска-выкладчыцкага складу гістарычнага факультэта. У праекце будуць апрацаваны матэрыялы пра жыццё і навукова-даследчую працу выкладчыкаў, якія зрабілі найбольш значны ўнёсак у развіццё БДУ і гістарычнай навукі. Да іх дадасца серыя відэастужак пра гісторыю факультэта, якая закранае міжваенны перыяд – 1920–30-я, час ВАВ, паваенныя гады, сучасны этап з 1991 г., а таксама цыкл пра мемарыяльныя дошкі.

Надзея МАРХЕЛЬ

УНІВЕРСІТЭТ
8 чэрвеня 2020 года, № 9 (2231)

Навука, мастацтва і прафесія

Да 30-годдзя кафедры паліталогіі БДУ

Толькі нямногія могуць ствараць палітыку, але абмяркоўваць яе могуць усе.

Перыкл

У сучасным свеце прыняцце рацыянальных палітычных рашэнняў – гэта адначасова навука, мастацтва і прафесія. Прафесійна падрыхтаваныя спецыялісты ў галіне палітычных навук – «адзінкавы тавар», яны дапамагаюць спасцігнуць сэнс заняў, рашэнняў палітыкаў, дзеянняў уладных інстытутаў, а таксама рэакцыю грамадскасці на значныя падзеі ў краіне. Прафесійны шлях сучаснага палітолага можа быць звязаны з аналітычнай, кансалтынгавай, навукова-даследчай, педагагічнай, кіраўнічай і юрыдычнай дзейнасцю: у структурах дзяржаўнай улады і кіравання, апаратах палітычных партый і грамадскіх арганізацый, СМІ, бізнес-структурах, сферы PR і GR.

Круглы стол выкладчыкаў кафедры паліталогіі і студэнтаў аддзялення паліталогіі з прафесарам Універсітэта прыкладных навук Люцэрна (Швейцарыя) Урсулай Сury (Ursula Sury) па праблемах лічбавай трансфармацыі сацыяльна-палітычнай сферы. Сакавік 2020 г.

Феномен на постсавецкай прасторы

Цэнтрам айчыннай палітычнай навукі з'яўляецца кафедра паліталогіі юрыдычнага факультэта БДУ. Тэрмін «паліталогія» з'явіўся ў назве агульнаўніверсітэцкай кафедры БДУ яшчэ ў 1990 г., калі ў адпаведнасці з пастановай Вучонага савета БДУ кафедра навуковага камунізму была трансфармавана ў кафедру сацыяльна-палітычных тэорый і паліталогіі. У 1991 г. загадчыкам кафедры быў абраны Аляксандр Мухтаравіч БАЙЧОРАЎ, які мэў вопыт дыпламатычнай службы. Прафесар А. М. Байчораў раней працаваў у дэпартаменце па палітычных пытаннях і справах Савета Бяспекі Сакратарыята ААН (г. Нью-Ёрк), загадаваў кафедрай філасофіі і сацыялогіі ў Інстытуце паліталогіі і сацыяльнага кіравання (г. Мінск). Дзякуючы яго высілкам было адкрыта першае ў нашай краіне аддзяленне паліталогіі, створаны савет па прысуджэнні навуковых ступеняў доктара і кандыдата палітычных навук у БДУ. У той перыяд ішлі працэсы перасэнсавання савецкіх сацыяльна-палітычных ведаў. Новыя паліталагічныя курсы ствараліся літаральна па зярнятку, на кафедры рэгулярна абмяркоўваліся новыя тэксты лекцый і новыя навучальныя дысцыпліны. Выдаваўся ўласны грамадска-палітычны бюлетэнь «Кансэнсус», які выходзіў на рускай і англійскай мовах. У 1992 г. кафедра сацыяльна-палітычных тэорый і паліталогіі была пераўтворана ў кафедру паліталогіі і пераведзена на філасофска-эканамічны факультэт.

У 1993 г. загадчыкам кафедры паліталогіі стаў Сяргей Васільевіч РАШЭТНІКАЎ, які ініцыяваў адкрыццё ўнікальнай кваліфікацыі «палітолаг-юрыст». У 1994 г. кафедра і аддзяленне паліталогіі былі пераведзены на юрыдычны факультэт. С. В. Рашэтнікаў у 1995 г. абараніў дысертацыю і атрымаў дыплом доктара палітычных навук пад нумарам 1 у нашай краіне. У новы перыяд развіцця кафедры яе супрацоўнікі сталі заснавальнікамі сістэмнага вывучэння палітычнай навукі, распрацавалі першую ў краіне тыпавую навучальную праграму «Паліталогія» (1998) і шэраг навучальных дапаможнікаў. Падрыхтоўка спецыялістаў з кваліфікацыяй «палітолаг-юрыст» – унікальная з'ява на постсавецкай прасторы, дзе паліталагічнае навучанне вядзецца або на філасофскіх, або на гістарычных факультэтах (у наш час у Расіі створаны самастойныя факультэты палітычных навук).

Падрыхтоўка палітолагаў-прафесіяналаў

На сучасным этапе кафедра рэалізуе двуадзіную задачу: прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці «паліталогія» з кваліфікацыяй «палітолаг-юрыст» і выкладання паліталогіі і дысцыплін паліталагічнага профілю («Дзяржаўная палітыка і кіраванне», «Грамадская палітыка», «Палітычныя тэхналогіі», «Палітычная камунікацыя», «Тэорыя палітычных сістэм», «Палітычная культура» і інш.) на ўсіх факультэтах БДУ. Кафедра паліталогіі прымяняе інтэгральны падыход у выкладанні, што дазваляе павышаць якасць адукацыі, забяспечваць унёсак у экспарт адукацыйных паслуг. На кафедры распрацаваны 44 навучальныя дысцыпліны, выкладанне якіх забяспечваецца пасродкам прымянення сучасных адукацыйных тэхналогій. На кафедры працуюць найлепшыя прафесіяналы ў галіне паліталагічнай адукацыі: 4 дактары навук (з іх 3 – дактары палітычных навук), 13 кандыдатаў навук (з іх 8 – кандыдаты палітычных навук).

Кафедра паліталогіі, з'яўляючыся выпускаючай, забяспечвае поўны цыкл падрыхтоўкі спецыялістаў на першай ступені адукацыі, на ўзроўні магістратуры, аспірантуры і дактарантуры. З 1992 па 2019 гг. па спецыяльнасці «паліталогія» з кваліфікацыяй «палітолаг-юрыст» было падрыхтавана 636 спецыялістаў, з іх 108 атрымалі дыпломы з адзнакай, многія сталі лаўрэатамі і стыпендыятамі спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Сярод нашых выпускнікоў – дзяржаўныя службоўцы рэспубліканскіх і мясцовых органаў улады, апарату Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, НАН Беларусі, сістэмы органаў пракуратуры, работнікі адукацыі і навукі, супрацоўнікі аналітычных аддзелаў і цэнтраў розных арганізацый, бізнес-структур, банкаў і спецыялісты ў сферы НДА і НКА. Кваліфікацыя «палітолаг-юрыст» запатрабавана на рынку працы, паколькі забяспечвае варыятыўнасць будучай працоўнай дзейнасці з прычыны ўнікальнага спалучэння паліталагічных і прававых ведаў, фундаментальнасці падрыхтоўкі выпускнікоў.

Кафедра паліталогіі з'яўляецца вядучай навуковай установай у краіне па падрыхтоўцы аспірантаў і дактарантаў. У перыяд з 1992 па 2019 гг. у савеце пры БДУ былі абаронены: 41 кандыдацкая дысертацыя, 10 доктарскіх дысертацый па палітычных навуках.

Наладжаны трывалыя кантакты і абмен інфармацыяй з навуковымі цэнтрамі Германіі, Вялікабрытаніі, Польшчы, Расіі, Казахстана, Туркменістана. Філіял кафедры функцыянуе пры ДНУ «Інстытут філасофіі НАН Беларусі». Пры кафедры працуе навучальная лабараторыя палітычных тэхналогій і студэнцкі навукова-практычны гурток па паліталогіі. Кафедрай вядзецца актыўная праца ў сферы прафесійнай арыентацыі абітурыентаў.

У рамках курса «Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы» ажыццяўляецца фарміраванне патрыятычных і грамадзянскіх каштоўнасцяў у студэнтаў, асноўныя з якіх – любоў да Беларусі, да добрасумленнай працы, актыўная грамадзянская пазіцыя і адказнасць.

Пра кафедру паліталогіі БДУ можна з упэўненасцю сказаць, што палітычная навука і паліталагічная адукацыя – наша прафесійнае прызначэнне. Доўгіх гадоў жыцця, любімая кафедра!

Ніна АНТАНОВІЧ,
загадчыца кафедры паліталогіі юрыдычнага факультэта БДУ, выкладчыкі кафедры: прафесар Сяргей РАШЭТНІКАЎ, дацэнт Святлана ПАРЭЧЫНА, дацэнт Алена ІЛЬІНА, дацэнт Вольга ПАБЯРЭЖНАЯ

Водгукі выпускнікоў

Яўген ХАРУК, начальнік аддзела аналітыкі і прагназавання БДУ (выпускнік 2014 г.): «Кафедра паліталогіі – гэта нешта большае, чым проста адна з кафедраў на факультэце. Дзякуючы прадметам, выкладчыцкаму складу і, самае галоўнае, асаблівай атмасферы, фарміруецца шырокі светапогляд на розныя рэчы ў сучаснасці.

Асабіста я лічу, што навучанне на кафедры дапамагае аналізаваць шматлікія грамадскія працэсы, не адчуваць страху перад новымі ведамі. Той бэкграўнд літаратуры, якая вывучаецца ў рамках заняткаў, дазваляе развівацца як асобе і як спецыялісту».

Анастасія НЯНАШАВА, сацыяльны педагог сацыяльна-псіхалагічнай службы ДУА «Сярэдняя школа № 93 г. Мінска» (выпускніца 2012 г.): «У выбары спецыяльнасці першае, што прыцягнула, – яе ўнікальнасць і ўніверсальнасць: набор спецыялістаў для падрыхтоўкі вельмі абмежаваны не толькі ў маштабах факультэта, але і краіны, а сфера прымянення ведаў і навыкаў, а таксама іх значнасць глабальныя. Падчас вучобы я зразумела, што кафедра паліталогіі не рыхтуе палітыкаў. Яна выпускае спецыялістаў, гатовых стаць незаменнымі для палітыкаў – „правай рукой", „вачыма", „вушамі" – і аказваць прафесійную дапамогу ў кіраванні гіганцкімі ўладнымі механізмамі на розных участках дзяржаўнага будаўніцтва. Менавіта імкненне прынесці карысць грамадству і дзяржаве сваёй працай – найлепшая якасць палітолага-юрыста».

Мікіта БЯЛЯЕЎ, каардынатар праекта «Падтрымка эканамічнага развіцця на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь», які рэалізуецца Праграмай развіцця ААН у партнёрстве з Міністэрствам эканомікі Беларусі (выпускнік 2011 г.): «Перыяд навучання ва ўніверсітэце быў напоўнены цікавымі падзеямі і знаёмствамі. Важна, што нам не проста выкладалі паліталагічныя дысцыпліны, а вучылі весці дыскусію, аналізаваць падзеі і працэсы. Я часта выкарыстоўваю веды, атрыманыя з курсаў метадалогіі, параўнальнай палітыкі, тэорыі прыняцця палітычных рашэнняў, а таксама прававых дысцыплін. Сёння мая праца патрабуе добрых аналітычных навыкаў і ўменняў, здольнасці выбудоўваць узаемадзеянне на розных узроўнях, а таксама распрацоўваць і рэалізоўваць новыя ідэі. Цяпер кафедра пайшла далёка наперад: з'явіліся новыя прадметы і дысцыпліны, выкладчыкі, фарматы і метады навучання».

Мікіта ЯДЛОЎСКІ, вядучы спецыяліст управлення заканадаўства Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь (выпускнік 2016 г.): «Навучанне на спецыяльнасці „паліталогія" заклала асновы маёй прафесійнай кампетэнцыі. Выкладчыкі не проста далі мне самавіты багаж ведаў, але яшчэ і прывілі здольнасці эфектыўнай камунікацыі, крытычнага мыслення, працы з вялікімі аб'ёмамі інфармацыі і канструктыўных паводзін у крызісных сітуацыях. Дзякуючы атрыманым навыкам я паспяхова прайшоў пераддыпломную практыку ў Міністэрстве юстыцыі, і мяне ўзялі на дзяржслужбу».

Андрэй СУЛЕЙКАЎ, малодшы навуковы супрацоўнік Цэнтра дзяржаўнага будаўніцтва і права Інстытута эканомікі НАН Беларусі (выпускнік 2017 г.): «Адмысловую каштоўнасць навучанню на кафедры паліталогіі надае тое, што веды, навыкі і здольнасці, якія прывіваюцца студэнтам, найбольш блізкія да таго, што прынята называць класічнай адукацыяй. За гады, праведзеныя мною ў якасці студэнта, я не проста атрымаў спецыяльнасць ці веды, але набыў здольнасць самастойна вучыцца і асвойваць новыя навыкі, думаць, аналізаваць, структураваць выкладаць свае думкі, а таксама ўзаемадзейнічаць з аднадумцамі і апанентамі розната профілю. Гэты вопыт быў часта неабходны ў маёй прафесійнай дзейнасці... Хацеў бы падзякаваць усім выкладчыкам кафедры за тое, што як прафесіянал і шмат у чым як асоба я сфарміраваўся менавіта пад іх чулым і ўважлівым кіраўніцтвам».

УНІВЕРСІТЭТ
8 чэрвеня 2020 года, № 9 (2231)

Творчая 100

У БДУ падвялі вынікі конкурсу студэнцкіх фота і відэа

«Мінімалізм». Сафія Назарук

«Чорна-белае». Раман Бондар



«Аўтапартрэт». Анастасія Буткевіч

Polaroid Vibes. Аляксандра Сідарэвіч

«АРТ-гісторыя». Вольга Казлоўская

Кадры з відэа «Пакаленне Y». Дар'я Васільева

Майстры жывапісу святлом – так называюць тых, хто працуе з кадрам. Гэта мастацтва асабліва любяць студэнты БДУ, іх творчы струмень невычарпальны, бо кожны год на конкурс студэнцкіх фота і відэа «БДУ ў тваім фармаце» мноства заявак. Сёлетні атрымаў сто адборных прац, а вось пераможцаў усяго шэсць. Хто ж яны? Для вас даведалася газета «Універсітэт».

Працы прымаліся ад пачатку да сярэдзіны мая, а 25-га экспертнае журы падвяло вынікі, назваўшы пераможцаў. Сёлета былі ўведзены сем новых намінацый, а таксама абноўлены лагатып і афармленне. Гэтыя і іншыя змены расплумачыў арганізатар конкурсу са Студсаюза БДУ **Ягор АЛІФЕРКА:**

– Сёлета ўдзельнік у кожную намінацыю мог даслаць толькі адну працу, што значна скараціла іх колькасць і зрабіла ацэньванне больш сумленным. Прац мы атрымалі роўна сто! Некаторыя намінацыі паўтараліся на працягу некалькіх гадоў, і гэта было недахопам праекта. Мы вырашылі памяняць канцэпт: паказаць чалавеку, не што здымаць, а як здымаць. Абмежаваць яго толькі стылем фатаграфіі, вызваліўшы творчую фантазію. І, мяркуючы па водгуках студэнтаў, гэта было правільным рашэннем.

Арганізатарамі конкурсу выступілі *Студэнцкі саюз БДУ* і *ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю*. Сёлета журы было амаль цалкам прафесійным: гэта фатографы і відэографы высокага ўзроўню, якія ўваходзяць у топ-спісы па краіне, здымаюць вокладкі вядомых часопісаў. Ацэньвалі працы праз сайт з творчасцю канкурсантаў, іх у кожнай намінацыі прыкладна 20–30. Самай дыскусійнай стала намінацыя «Чорна-белае» і Polaroid Vibes, і калі з апошняй усё ж прыйшлі да адзінага меркавання, то наконт першай абмеркаванні не сціхаюць дагэтуль. Сваім экспертным меркаваннем пра відэапрацы ўдзельнікаў падзяліўся **Андрэй ПАЛУПАНАЎ,** дырэктар «Кінашколы-студыі Андрэя Палупанава»:

– Канкурсанты прыемна парадавалі сваім узроўнем тэхнічнай падрыхтоўкі. Чыста візуальна гэта было цікава: пісьменная праца з камерай, мантажом, спецэфектамі. Галоўным чынам, форма ва ўдзельнікаў на добрым узроўні, а змест правальваецца. На гэтым варта зрабіць акцэнт і працаваць над драматургіяй, канфліктам, пасланнем гледачу. У цэлым было вельмі моцна. Такія конкурсы трэба праводзіць, іх павінна быць больш, неабходна стымуляваць студэнтаў прызамі, спаборніцкі момант таксама працуе добра. Усім жадаю поспехаў.

ПЕРАМОЖЦЫ Ў НАМІНАЦЫЯХ «ФОТАПРАЦА»:

- **«Чорна-белае»** – ***Раман Бондар***, факультэт геаграфіі і геаінфарматыкі
- **«Мінімалізм»** – ***Сафія Назарук***, біялагічны факультэт
- **«Аўтапартрэт»** – ***Анастасія Буткевіч***, факультэт сацыякультурных камунікацый
- **Polaroid Vibes** – ***Аляксандра Сідарэвіч***, юрыдычны факультэт
- **«АРТ-гісторыя»** – ***Вольга Казлоўская***, факультэт сацыякультурных камунікацый

ПЕРАМОЖЦА Ў НАМІНАЦЫЯХ «ВІДЭАПРАЦА»:

- **Take Me Home** – ***Дар'я Васільева***, Інстытут бізнесу БДУ
- **«Пакаленне Y»** – ***Дар'я Васільева***, Інстытут бізнесу БДУ

УЛАДАЛЬНІЦАЙ ГРАН-ПРЫ КОНКУРСУ таксама стала студэнтка 4 курса Інстытута бізнесу ***Дар'я Васільева*.**

Галоўная пераможца конкурсу падзялілася сваімі ўражаннямі:

– Мяне перапаўняюць эмоцыі! Вядома, атрымаць гэту ўзнагароду было б немагчыма без падтрымкі маіх родных і блізкіх. Бацькі любяць глядзець мае відэа і заўсёды выступаюць першымі маімі крытыкамі. Мне падабаецца быць відэографам дзякуючы тым выдатным людзям, якіх я здымаю. Мне падабаецца шукаць да кожнага падыход, развіваць свае камунікатыўныя навыкі. Гэта ўзнагарода стане напамінам пра творчы час майго студэнцтва ў БДУ. Таксама хацелася б выказаць адмысловую падзяку арганізатарам дадзенага праекта, бо ў такі няпросты час у іх атрымалася прыдумаць новы фармат!

Фотапрацы ўдзельнікаў размесцяць у калідоры першага паверха галоўнага корпуса БДУ, а таксама на анлайн-старонцы дадзенага праекта. Уладальніца гран-пры атрымае прафесійны штатыў, а пераможцы ў фотанамінацыях – бясплатнае навучанне ў мінскім філіяле Санкт-Пецярбургскай школы тэлебачання, вялікія зніжкі на навучанне прафесійнай камерцыйнай фатаграфіі і дызайну, статуэткі, дыпломы і атрыбутыку конкурсу – кубкі, майкі з лагатыпам.

Надзея МАРХЕЛЬ

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

8 чэрвеня 2020 года
Падпісана да друку 5.06.2020 г.
Зак. 181. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ».
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, г. Мінск.

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 804, 802, тэл. 259-70-77, 259-70-65
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by